ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

# Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

**Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 5-10 жніўня**

*Назіранне за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».*

## ВЫСНОВЫ

- выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў 2019 г. адбываюцца на фоне складаных палітычных абставінаў у свеце і Еўропе, ва ўмовах пэўнага прагрэсу ў адносінах Беларусі з ЗША, краінамі Еўразвязу і двухбаковага крызісу ў беларуска-расійскіх адносінах;

- наладжана супрацоўніцтва Беларусі і дэмакратычных краін па многіх напрамках, пэўная лібералізацыя ў грамадска-палітычнай і культурнай сферы назіраецца на фоне бесперапынных парушэнняў дзяржавай правоў чалавека;

- выбары будуць праводзіцца па заканадаўстве, у якім не ўлічаны найбольш важныя рэкамендацыі з боку назіральнікаў і міжнародных структур;

- Указ прэзідэнта аб прызначэнні выбараў у Палату прадстаўнікоў на 17 лістапада 2019 г. парушае канстытуцыйную норму пра тэрмін паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, істотна скарачае тэрмін паўнамоцтваў дзеючага Парламента і з'яўляецца ўмяшальніцтвам у дзейнасць органа заканадаўчай улады.

## ПРАВАВАЯ АСНОВА

Прававую аснову выбарчай сістэмы Рэспублікі Беларусь складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Выбарчы кодэкс і іншыя заканадаўчыя акты Рэспублікі

Беларусь, а таксама пастановы Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (далей – Цэнтральная выбарчая камісія, ЦВК).

З часу папярэдніх выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу (*далей* – Палата прадстаўнікоў, ПП НС) Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь не мяняўся. Рэкамендацыі АБСЕ і Венецыянскай камісіі, вынесеныя па выніках назірання за палітычнымі выбарамі ў Беларусі, у прыватнасці па фарміраванні выбарчых камісій, правах кандыдатаў, правах назіральнікаў, рэкамендацыі, якія тычацца галасавання, падліку галасоў і звядзенне вынікаў да гэтага часу не былі ўлічаны.

## ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

Выбары праходзяць на фоне складаных палітычных абставінаў у свеце і Еўропе, якія істотна змяніліся, у тым ліку ў сувязі з расійска-украінскім канфліктам. Тэндэнцыя да пацяплення адносінаў паміж Беларуссю, з аднаго боку, і ЗША, краінамі Еўразвязу з другога, якая азначылася яшчэ перад папярэднімі выбарамі ў Палату прадстаўнікоў, прывяла да пэўных пазітыўных зменаў ва ўнутранай палітыцы. Улады пашырылі супрацоўніцтва з ААН і іншымі міжнароднымі арганізацыямі ў галіне правоў чалавека.

Аднак становішча з захаваннем у Беларусі правоў чалавека застаецца стабільна дрэнным і сістэмных пазітыўных змяненняў у гэтай галіне не адбываецца. Прагрэсіўныя змены ў заканадаўстве, якія рэгулююць ажыццяўленне правоў і асноўных свабод, – дэкрыміналізацыя ўдзелу ў дзейнасці незарэгістраваных арганізацый, увядзенне элементаў заяўнага прынцыпу арганізацыі масавых мерапрыемстваў – суправаджаюцца ўвядзеннем адміністрацыйнай адказнасці за тыя ж дзеянні і ўсталяваннем высокіх ставак за абавязковую ахову міліцыяй грамадскага парадку на масавых мерапрыемствах.

Аб адсутнасці рэальнага імкнення да дэмакратычных зменаў сведчаць рэпрэсіі ў дачыненні да грамадзян, якія рэалізоўвалі свае канстытуцыйныя правы на свабоду меркаванняў і іх выказвання, свабоду мірных сходаў і веравызнанняў, пераслед незалежных журналістаў, а таксама непрынятае мер па аднаўленні ў поўным аб'ёме палітычных і выбарчых правоў былых палітвязняў.

## ПРЫЗНАЧЭННЕ ВЫБАРАЎ І АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫБАРЧАГА ПРАЦЭСУ

Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (Арт. 91) і Выбарчага кодэкса (Арт. 56), выбары ў Палату прадстаўнікоў сёмага склікання прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь не пазней за 4 месяцы і праводзяцца не пазней за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання.

Канстытуцыяй (Арт. 93) усталяваны чатырохгадовы тэрмін паўнамоцтваў Парламента. Паўнамоцтвы ПП НС шостага склікання, абранай у 2016 г., заканчваюцца ў кастрычніку 2020 г.

Аднак ў канцы красавіка 2019 г. А. Лукашэнка ў пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу паведаміў пра тое, што выбары ў Палату прадстаўнікоў адбудуцца ў лістападзе 2019 г.

З улікам гэтага, 29 мая ЦВК на сваім пасяджэнні зацвердзіла сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу, якая па Выбарчым кодэксе вызначаецца не пазней, чым за 5 месяцаў да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання.

Тады ж, 29 траўня, былі зацверджаныя Практычны дапаможнік для тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання і Зборнік метадычных матэрыялаў для ўчастковых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Прызначэнне выбараў адбылося 5 жніўня 2019 г., калі прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў указ №294 аб прызначэнні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Выбары прызначаны на 17 лістапада 2019 г.

Паколькі падстаў для датэрміновага спынення паўнамоцтваў Парламента, прадугледжаных Арт. 94 Канстытуцыі, няма, а чатырохгадовы тэрмін яго паўнамоцтваў не мінуў, гэты ўказ парушае канстытуцыйную норму пра тэрмін паўнамоцтваў Парламента і з'яўляецца ўмяшальніцтвам у дзейнасць органа заканадаўчай улады. Істотнае скарачэнне тэрміну паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў паменшыла колькасць сесій заканадаўчага органа да сямі (ПП НС чацвёртага склікання правяла 11 сесій, пятага склікання – 10 сесій).

6 жніўня 2019 г. адбылося пасяджэнне ЦВК, на якім былі разгледжаны пытанні падрыхтоўкі выбараў.

Былі прынятыя:

Пастанова № 19 “Аб зацвярджэнні Каляндарнага плана арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова № 22 “Аб стварэнні выбарчых акруг па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова 2019 г. № 23 “Аб тлумачэнні парадку стварэння выбарчых камісій пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова 2019 г. № 24 “Аб тлумачэнні прымянення палажэнняў Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць парадак вылучэння кандыдатаў у дэпутаты шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова № 25 “Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку накіравання і дзейнасці назіральнікаў пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова № 26 “Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку дзейнасці замежных (міжнародных) назіральнікаў пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова №27 “Аб інфармаванні грамадзян пра работу па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова № 28 “Аб парадку ўдзелу грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, у выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова № 29 “Аб стварэнні дадатковых умоў для ўдзелу ў выбарах грамадзян з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова № 30 “Аб устанаўленні формаў дакументаў па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”;

Пастанова ад 6 жніўня 2019 г. №37 “Аб пазабюджэтным фондзе для дадатковага фінансавання расходаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”.

Названыя пастановы і зацверджаныя імі дапаможнікі не ўносяць істотных навацый у існуючы парадак правядзення выбараў, у прыватнасці – не тлумачаць парадак падліку галасоў выбаршчыкаў. Такім чынам, самы адчувальны момант, які выклікаў асаблівую крытыку назіральнікаў, застаўся нязменным, што сведчыць аб незацікаўленасці ЦВК у арганізацыі празрыстага падліку галасоў.

Пастанова і метадычныя матэрыялы ЦВК прадугледжваюць дадатковыя меры па паляпшэнні даступнасці выбарчай кампаніі для людзей з інваліднасцю.

Знята татальная забарона для назіральнікаў рабіць фотаздымкі на выбарчым участку. Аднак гэта нельга ацэньваць як пашырэнне правоў назіральнікаў і

ўзмацненне гарантый галоснасці пры правядзенні выбараў, паколькі метадычным дапаможнікам прадугледжана магчымасць «дазваляць назіральнікам па іх просьбе зрабіць некалькі фотаздымкаў», што істотна абмяжоўвае правы назіральнікаў у выкарыстанні фота- і відэаздымкі для фіксацыі парушэнняў на выбарчым участку.

Як і падчас папярэдніх кампаній, ЦВК працягвае практыку выбарачнай публікацыі пастаноў ЦВК, непрымальную з пункту гледжання забеспячэння прынцыпу галоснасці ў працэсе выбараў. Так, невядома, чаму не былі апублікаваны пастановы №№ 20, 21, 31-36.